*Настаўнік прапануе*

# ТЭКСТАЦЭНТРЫЧНЫ ПАДЫХОД ЯК НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ФАРМІРАВАННЯ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ

Арыентаванасць на тэкст – адзін з кірункаў у выкладанні беларускай мовы ў сучаснай школе. У працэсе работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы на II і III ступенях адукацыі фарміруецца моўная і камунікатыўная кампетэнцыя вучняў, развіваецца маўленне, нараджаецца "маўленчая індывідуальнасць вучня" (М. Бахцін), што стварае ўмовы для ажыццяўлення функцыянальнага падыходу пры вывучэнні лексікі, марфалогіі, сінтаксісу; фарміравання ўяўленняў пра моўную сістэму, рэалізацыі ўнутрыпрадметных, а таксама міжпрадметных сувязей беларускай мовы і літаратуры; асобасна арыентаванага выкладання беларускай мовы, фарміравання моўных кампетэнцый асобы.

Праз тэкст адбываецца далучэнне вучняў да нацыянальнай культуры; апора на тэкст пры вывучэнні лексікі, марфалогіі, сінтаксісу стварае ўмовы для духоўнага і маральнага выхавання навучэнцаў, для развіцця іх творчых здольнасцей.

Тэксты, выбраныя настаўнікам у адпаведнасці з асаблівасцямі ўзросту вучняў, выклікаюць у іх цікавасць, жаданне пранікнуць у сюжэтныя калізіі. Шляхам умелага падбору тэкстаў настаўнік можа даваць веды, якія не толькі пашыраюць кругагляд вучняў, але і актывізуюць іх творчыя здольнасці.

Прапануем элементы ўрокаў з апорай на тэкстацэнтрычны падыход.

**Тэма ўрока:** Віды складаных сказаў.

*Матэрыял для паўтарэння:* просты сказ, тыпы выказнікаў.

*Мэта ўрока:* фарміраванне ўмення вызначаць розныя віды складаных сказаў у тэксце, замацаванне ўмення пастаноўкі коскі ў складаным сказе.

Тэкст запісваецца пад дыктоўку ў пачатку ўрока, пасля праверкі дамашняга задання.

**Князёўна з трыма імёнамі**

(1) Даўным-даўно ў полацкага князя Рагвалода нарадзілася дачка, якую назвалі Рагнеда. (2) Калі ёй споўнілася чатырнаццаць гадоў, пасваталіся да яе два браты – кіеўскі князь Яраполк і Наўгародскі князь Уладзімір. (3) Браты паміж сабой варагавалі. (4) Малодшы Уладзімір не хацеў падначальвацца старэйшаму Яраполку. (5) Наспявала вайна. (6) Браты разлічвалі, што князь Рагвалод дапаможа сваім войскам таму, хто з іх стане мужам яго дачкі.

(7) Рагнедзе спадабаўся Яраполк, а Уладзіміру яна са згоды бацькі адмовіла. (8) Разгневаны Уладзімір сабраў вялікае войска і нечакана напаў на Полацк. (9) Палачане мужна абараняліся, але Наўгародскае войска ўсё ж перамагло. (10) Параненага князя Рагвалода, яго жонку і двух сыноў забілі. (11) А Рагнеду Уладзімір сілай прымусіў стаць сваёй жонкай. (12) Паводле старадаўняга звычаю жанчына, калі выходзіла замуж, мяняла імя. (13) Рагнеда стала Гарыславай.

Прапанаваны тэкст дазваляе паўтарыць розныя арфаграфічныя і пунктуацыйныя правілы: правапіс зычных у корані; правапіс *не* / *ня*, *ні* з рознымі часцінамі мовы; правапіс прыметнікаў з суфіксам *-ск-*; знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

Да тэксту могуць быць прапанаваныя наступныя заданні:

1. Знайдзіце простыя сказы. Выдзеліце граматычныя асновы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Зрабіце сінтаксічны разбор 8-га (3, 4, 5, 8, 10, 11, 13) сказа.
2. Знайдзіце складаныя сказы. Па якой прымеце вы гэта вызначылі? Падкрэсліце граматычныя асновы сказаў у складзе складанага. Чым выражаны дзейнік, выказнік. Вызначце тыпы выказнікаў.
3. Знайдзіце словы, якія могуць праілюстраваць правіла напісання зычных у корані слова. Падкрэсліце арфаграмы.
4. Выпішыце дзеепрыметнікі, зрабіце іх словаўтваральны разбор.

Заданняў можа быць больш ці менш у залежнасці ад узроўню навучанасці класа. Такі падыход дазваляе ўжо на першым этапе ўрока хутка і эфектыўна паўтарыць неабходныя правілы і аб'яднаць традыцыйныя віды работ: арфаграфічную размінку, сінтаксічную хвілінку, слоўнікавую работу. Далей у працэсе ўрока настаўнік можа зноў звяртацца да запісанага тэксту.

5. Знайдзіце складаныя сказы са злучальнай, падпарадкавальнай сувяззю. Як вы гэта вызначылі?
6. Ці сустракаецца складаны сказ з бяззлучнікавай сувяззю паміж часткамі? Складзіце сказ з бяззлучнікавай сувяззю, абапіраючыся на матэрыял дадзенага тэксту.

У канцы ўрока можа быць прапанавана творчае заданне. Ці ведаеце вы, як далей склаўся лёс

князёўны? Напішыце, выкарыстоўваючы складаныя сказы розных відаў сувязі.

Такім чынам, на адным уроку вучні дэманструюць валоданне нормамі маўлення, праводзяць элементарны лінгвістычны аналіз, вучацца адэкватна ўспрымаць аўтарскі тэкст, аргументавана выкладаць свой пункт погляду і ствараць уласны тэкст.

**Тэма ўрока:** Складаназлучаны сказ.

*Матэрыял для паўтарэння:* правапіс прыставак, пабочныя словы.

*Мэта ўрока:* фарміраванне ведаў пра розныя злучнікі ў складаназлучаным сказе.

Тэкст запісваем, пры запісе пад дыктоўку магчыма паралельнае паўтарэнне правіл арфаграфіі.

Часамі днём позняга лета пачынае хмурнець дзень, і гэта не збіраецца на дождж, а незаўважна падплылі павевы восені. Лёгкая плынь ветру зноў заціхне, і дзень зноў зіхаціць сонцам, але ўжо астаецца пячаць летняга адцвітання. У поўнай сіле сваёй цвітуць летнія кветкі, і трава адрастае пасля касы, а сэрца чуе, што не так ужо гудзе пчала над жоўтым малачайнікам, і вада ў рэчцы плыве, здаецца, цішэй. Яшчэ ў пачатку ліпеня, бывае, зжаўцее адзін-адзінюткі лісток на бярозе, і так ён сярод пышнай зеляніны трымаецца доўга. А ў гэты дзень ён адарвецца і кружыцца ў паветры, пакуль не ляжа на траву. К вечару пакідае звінець неабдымная шырыня летняга дня, і кладзецца цішыня на зямлю (К. Чорны).

Заданні да тэксту могуць быць прапанаваныя па варыянтах: І варыянт. Выдзеліць граматычныя асновы ў 1-м сказе; ІІ варыянт. Вызначыць, як звязаныя прэдыкатыўныя адзінкі ў 1-м сказе.

Пасля выканання гэтых заданняў работу з тэкстам можна працягнуць наступным чынам:

1. У 2-м сказе вызначыць сродак сувязі паміж часткамі, растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.
2. Знайсці аднародныя члены сказа, растлумачыць, як яны звязаныя паміж сабой.
3. Знайсці злучальныя злучнікі, указаць, што яны звязваюць.
4. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў 3-м сказе.
5. Зрабіць марфалагічны разбор слова *жоўтым*.
6. Правесці словаўтваральны аналіз слова *адцвітанне*.

Наступны мікратэкст можа быць выкарыстаны пры рабоце над *тэмай* “Складаназалежны сказ з даданымі азначальнымі часткамі”.

*Матэрыял для паўтарэння:* правапіс літар *е*, *я*, зычных у корані.

*Мэта ўрока:* фарміраваць веды пра даданыя азначальныя часткі ў складзе складаназалежнага сказа, сродкі сувязі ў дадзеных сказах, вучыць знаходзіць сказы з даданымі азначальнымі ў тэксце.

Тэкст запісваецца пад дыктоўку.

**Дзяды**

Дзяды – народны памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць памерлых родзічаў. Дзядамі называлі таксама дзень, калі адбываўся абрад, і нябожчыкаў, якіх ушаноўвалі.

Дзяды спраўлялі ў пэўныя дні тры-чатыры і больш разоў на год вясною і восенню. Галоўнымі былі Дзяды змітраўскія, якія адзначалі ў суботу перад Змітравым днём (дваццаць шостага кастрычніка старога стылю), а таксама на Радаўніцу і перад Масленіцай і Сёмухай.

На Дзяды гатавалі святочныя і абрадавыя стравы, з якіх абавязковымі былі куцця, бліны, клёцкі, яечня, мяса. Паводле звычаю, ад кожнай стравы сімвалічна адкладвалі ў асобны посуд частку нябожчыкам.

Заданні да тэксту:

1. Знайдзіце складаныя сказы з даданымі азначальнымі. Аргументуйце адказ.
2. Вызначце сродкі сувязі ў складаных сказах з даданымі азначальнымі. Якімі членамі сказа з’яўляюцца злучальныя словы?
3. Зрабіце сінтаксічны разбор перадапошняга сказа.
4. Выпішыце словы з літарамі *е*, *я*, растлумачце іх напісанне.
5. Знайдзіце лічэбнікі, запішыце іх у форме творнага склону.

**Тэма ўрока:** Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі.

*Мэта:* арганізаваць работу па вывучэнні складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі.

*Матэрыял для паўтарэння:* правапіс прыслоўяў, канчаткі назоўнікаў ІІ скланення ў родным склоне, удакладняльныя акалічнасці.

Вёска ляжала ў лагчыне. Акружаная з усіх бакоў цесным вянком лесу, яна бязладна збілася саламянымі стрэхамі і пачарнелымі платамі ў кучу, нібыта ёй не хапала месца, і амаль не відна была з густой зеляніны рослага вішняку і яблынь.

Але мне і не трэба было бачыць хат, я добра ведаў і так, дзе чыя стаіць і хто ў ёй жыве. Вось па правую руку, з краю, ля лугу, паўз які нешырокаю доўгаю паласою цягнуўся некалі аж да ле-

су калгасны агарод, горбіцца хатка дзядзькі Хведара, таго Хведара, якога застрэлілі немцы, калі ён вяртаўся ўночы з уюноў. Побач з Хведаравай хатай яшчэ летась чырванела бляшаным верхам хата, у якой жыў са сваёй сям'ёй Сахрон, чалавек, да якога ўся вёска, як у нас казалі, прытыкала вочы, бо быў Сахрон майстра на ўсе рукі. І ўсё, за што б ён ні браўся, выходзіла ў яго аднолькава прыгожа, моцна і навек. Сахронаву хату раскідалі немцы, зрабілі з яе масток цераз грэблю пасля таго, як партызаны неяк напрадвесні аблілі газай і спалілі той, што быў пасланы раней… Наша хата ў самай сярэдзіне, там, дзе вёска як бы згінаецца і дзе адзін канец яе паварочвае на поле…

Заданні да тэксту:

1. Які загаловак можна даць урыўку?
2. Якія мастацкія сродкі прысутнічаюць у тэксце?
3. Знайдзіце сказы з некалькімі даданымі, вызначце тып даданых сказаў, сродкі сувязі.
4. У чым адрозненне гэтых сказаў ад іншых?
5. Знайдзіце сказ з пабочнай канструкцыяй, ахарактарызуйце паводле значэння.
6. Падкрэсліце граматычныя асновы, укажыце, чым выражаны галоўныя члены сказа. Якія тыпы выказнікаў сустрэліся ў тэксце?

**Ірына КАЗАЧЭНКА,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Лельчыцкай раённай гімназіі.

*З вопыту работы*

# "ЖЫЦІЕ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ"

## УРОК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (IX КЛАС)

**Мэта і задачы:** прааналізаваць змест твора і ўзнавіць паслядоўнасць асноўных этапаў біяграфіі беларускай асветніцы; раскрыць паняцце "жыціе як жанр старажытнай літаратуры"; развіваць інтэлектуальныя здольнасці; выхоўваць пачуццё павагі да асобы асветніцы.

**Абсталяванне:** кніжная выстава "Я лячу да цябе, Радзіма, са святога Ерусаліма", прысвечаная жыццю і творчасці Еўфрасінні Полацкай, магнітафон, запіс старажытнай музыкі, карта Беларусі, ілюстрацыйны матэрыял (Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, Спаса-Еўфрасіннеўскі храм, дзе захоўваюцца мошчы святой Еўфрасінні, знак Цэнтр Еўропы ў Полацку, крыж Еўфрасінні Полацкай, Сафійскі сабор, помнік прападобнай Еўфрасінні Полацкай у Полацку, помнік Усяславу Чарадзею).

**Прагназуемыя вынікі ўрока:** у канцы ўрока вучні будуць ведаць асноўныя этапы жыцця Еўфрасінні Полацкай, разумець паняцце "жыціе як жанр старажытнай літаратуры", а таксама хрысціянкія традыцыі, якімі жыла Еўфрасіння Полацкая.

**Эпіграф:**

Я крывінка твая – крывічанка,
Я былінка твая – палачанка,
Як над пожняй тужлівая чайка,
Я лячу да цябе, Радзіма,
Са святога Ерусаліма.

В. Зуёнак.

"Была яна дапамогай пакрыўджаным, суцяшэннем смуткуючым, распранутым – адзеннем, хворым – наведаннем ці, проста кажучы, – для ўсіх была ўсім".

"Жыціе Еўфрасінні Полацкай".

### ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны момант.**

• ***Уступнае слова настаўніка.***

• ***Эмацыянальная падрыхтоўка вучняў да ўспрымання новай тэмы.***

• ***Зварот да эпіграфаў.***

**II. Актуалізацыя апорных ведаў.**

**Настаўнік.** Эпоха Сярэднявечча загадкавая, вабіць да сябе ўжо не адно стагоддзе. Ахоплівае амаль тысячу гадоў: з V па XIV стагоддзе. Ранняе Сярэднявечча (да 1000 г.) уражвае глабальнымі гістарычнымі зрухамі, позняе Сярэднявечча цягнулася ад 1000 года да чатырнаццатага стагоддзя. У эпоху позняга сярэднявечча жыла Еўфрасіння Полацкая.

• ***Гутарка па пытаннях.***

1. Якім быў чалавек таго часу? (*Чалавек Сярэднявечча глядзеў на свет інакш. Ён верыў, што зямное існаванне толькі рыхтуе да "сапраўднага" вечнага жыцця, якое чакала яго пасля смерці. Паводзіны і ўчынкі ацэньваліся па хрысціянскім маральна-этычным кодэксе, закладзеным у Бібліі. Пакорлівасць і паслухмянасць лічыліся галоўнымі вартасцямі і да-*